БЕЛАРУСКАЯ МАЛАДЗЁЖНАЯ ГАЗЕТА



ЧЗ

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА


25 чэрвеня 1994 г.
Субота
№ 68(13785)
Кошт у розніцу 100 рублёў
Выдаецца з 1921 года

Выбары першага прэзідэнта Рэспублікі Беларусь адбыліся. У іх прыняло ўдзел 78,95 працэнта грамадзян. Аднак, відаць, у першым туры ніхто з кандыдатаў не набраў дастатковай колькасці галасоў, каб заняць вышэйшую пасаду ў дзяржаве. У такім выпадку другі тур выбараў павінен адбыцца ў сярэдзіне ліпеня.

Як стала вядома па пярэдніх звестках, галасы за кандыдатаў у прэзідэнты размеркаваліся наступным чынам:
Аляксандр Лукашэнка, — 45,1%
Вячаслаў Кебіч — 17,4%
Зянон Пазьняк — 12,9%
Станіслаў Шушкевіч — 9,9%
Аляксандр Дубко — 6%
Васіль Новікаў — 4,6%.

Афіцыйныя звесткі аб канчатковых выніках галасавання стануць вядомы праз 10 дзён.

Малюе Віктар ДУБОВІК



Прэзідэнцкі марафон



У адной сям'і — шэсць прэзідэнтаў?

Марына Сяргееўна, хаця і не адзінокая жанчына, але нікому не верыць. "У чарговы раз падмануць" — думала яна, ідучы 23 чэрвеня на свой выбарчы ўчастак № 36 Маскоўскага раёна г.Мінска. Доўга вагаючыся, яна ўсё ж вырашыла не застацца ў баку ад гістарычнай падзеі — выбараў першага прэзідэнта Беларусі — і выкрэсліла пяць "лішніх", на яе думку, прозвішчаў. А ўвечары, сабраўшыся разам усёй сям'ёй, Марына Сяргееўна першая распачала гаворку пра доўгачаканыя выбары. І трэба ж... Яе сям'я ў складзе шасці чалавек галасавала за ... шасцярых розных кандыдатаў. У ход пайшлі спрэчкі, перакананні, доказы — кожны, безумоўна, адстойваў свайго "прэзідэнта". "Гэты хоць можа накарміць народ, а вось твой "выбраннік" нічога, акрамя галоснасці, даць не можа" — пераконваў Марыну Сяргееўну муж. "Няхай парадак спачатку навядуць, мафію перасаджаюць..." — не здаваўся Марынін сямідзесяцігадовы бацька. "А я ўсё ж лічу, што выбары павінны даць нам прэзідэнта–дэмакрата", — "гнуў" сваю лінію сын.

"Вось так, — думала Марына Сяргееўна. —Тут у сваёй уласнай сям'і колькі чалавек, столькі і прэзідэнтаў. Што ўжо гаварыць пра дзяржаву..."

— Хутчэй за ўсё дарэмна мы тут сварымся, з першага разу ніхто не пераможа, — прыйшоў на дапамогу ўсёй сям'і муж. А потым, трохі падумаўшы, дадаў ужо адной жонцы: — Гэта толькі пачатак, Марына.

М.ПЯТРОВА.

Кур'ер "ЧЗ"

Прадстаўнічая "каманда"

Прадстаўнікі дзевяці рэспублік былога Савецкага Саюза прыслалі сваіх наглядальнікаў на выбары першага прэзідэнта Беларусі. Найбольш шматлікай была "каманда" з Расіі. Тут прадстаўнікі Дзяржаўнай думы, расійскага Цэнтрвыбаркама, інстытута Крыбла. Прыслалі сваіх прадстаўнікоў Казахстан, Кыргызстан, Малдова, Украіна, адгукнуліся на запрашэнне кандыдатаў ад дэмакратычнага блоку Станіслава Шушкевіча і Зянона Пазьняка наглядальнікі сацыял–дэмакратычных партый Латвіі і Эстоніі, а таксама Літоўскай дэмакратычнай рабочай партыі.

Цэнтральная камісія па выбарах прэзідэнта Рэспублікі Беларусь не абмежавала наглядальнікаў якім-небудзь адным рэгіёнам. Ім было дадзена права прысутнічаць на любых выбарчых участках рэспублікі. Усяго ж толькі за апошнія два дні перад выбарамі Цэнтрвыбаркамам акрэдытаваны 72 замежныя наглядальнікі.

БЕЛІНФАРМ.

Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь N 467

АБ МЭТАВЫХ УКЛАДАХ НА ДЗЯЦЕЙ ДЛЯ БУДАЎНІЦТВА АБО НАБЫЦЦЯ ЖЫЛЛЯ

У мэтах стварэння грамадзянам умоў для накаплення сродкаў на набыццё і будаўніцтва жылля Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Згадзіцца з прапановай Ашчаднага банка аб увядзенні новага віду зберажэнняў — мэтавага ўкладу на дзяцей для будаўніцтва або набыцця жылля з выплатай даходу па ім у размеры 300 працэнтаў гадавых.

Мэтавы ўклад адкрываецца на імя грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, які нарадзіўся пасля 1 студзеня 1995 г., на суму 500 тыс.рублёў за кошт сродкаў Ашчаднага банка і захоўваецца да дасягнення ім 18-гадовага ўзросту. Датэрміновая і частковая выдача ўкладу і даходу па ім не робіцца. Пасля заканчэння тэрміну захоўвання ўклад выкарыстоўваецца строга па мэтавым прызначэнні шляхам безнаяўнага пералічэння яго ўкладчыку на будаўніцтва або набыццё жылля на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

2. Ашчаднаму банку ў тыднёвы тэрмін распрацаваць і зацвердзіць правілы правядзення аперацый па мэтавых укладах на дзяцей для будаўніцтва або набыцця жылля.

3. Міністэрству фінансаў прадставіць у Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прапановы аб унясенні ў заканадаўчыя акты змяненняў, якія прадугледжваюць вызваленне Ашчаднага банка ад платы падатку на прыбытак на суму сродкаў, накіраваных на адкрыццё мэтавых укладаў і выплату па іх даходаў.

Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь
В.КЕБІЧ.
Кіраўнік спраў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь
М.КАУКО.
21 чэрвеня 1994 г.
Мінск.

У гонар вялікага майстра

Пасольства дзяржавы Ізраіль у Беларусі накіравала зварот арганізатарам і ўдзельнікам І Міжнароднага фестывалю імя Марка Шагала ў Віцебску. У ім выказваецца надзея, што фестываль будзе першым у серыі міжнародных сустрэч у гонар вялікага майстра.

"Марк Шагал належыць не толькі яўрэйскаму народу, чым сынам ён з'яўляецца, не толькі беларускай зямлі, на якой ён нарадзіўся і вырас. Ягоная творчасць — частка сусветнай культуры. У Ізраілі ягоныя габелены ўпрыгожваюць залы парламента (кнесета), ягоныя вітражы сталі жамчужынай у адной з лепшых сінагог Іерусаліма. І ў кожнай з гэтых работ ёсць штосьці такое, што нагадвае пра Віцебск", — гаворыцца ў звароце.

Работнікі пасольства ад імя Міністэрства адукацыі і культуры Ізраіля, усіх знаўцаў і прыхільнікаў мастацтва майстроў віцебскай школы пажадалі ўдзельнікам фестывалю і пленэру вялікіх творчых поспехаў.

Чакаем гасцей з Кітая

29—30 чэрвеня ў Беларусь прыбывае афіцыйная дэлегацыя Кітайскай Народнай Рэспублікі. Яе ўзначальвае намеснік прэм'ера Дзяржсавета, міністр замежных спраў Кітая Цянь Цычэнь.

Як стала вядома карэспандэнту БЕЛІНФАРМА, у першы дзень знаходжання ў Мінску госці з Кітая правядуць перагаворы з міністрам замежных спраў краіны Пятром Краўчанкам і прэм'ер-міністрам Вячаславам Кебічам. 30 чэрвеня афіцыйная дэлегацыя сустрэнецца са Старшынёй Вярхоўнага Савета Беларусі Мечаславам Грыбам. Пасля заканчэння гэтай сустрэчы плануецца правядзенне прэс-канферэнцый для журналістаў.

Ад родных хат паклон і прывітанне

Мінскі мікрараён Малінаўка збіраецца сёння ўволю паспяваць і паскакаць. У госці да тых, каго чарнобыльская навала прымусіла пакінуць родны кут, прыехалі землякі з Чачэрскага раёна.

Міністэрства культуры і друку, мясцовыя ўлады Чачэрскага раёна, якія наладжваюць свята, вельмі спадзяюцца, што і ў іншых "чарнобыльскіх" раёнах успомняць пра сваіх землякоў.

БЕЛІНФАРМ.

Моладзь не дрэмле...

Дзве новыя маладзёжныя арганізацыі з'явіліся нядаўна ў Гродна і адразу заняліся канкрэтнымі справамі.

"Ліга добраахвотнай працы моладзі" дапамагае юнакам і дзяўчатам знайсці працу ў вольны ад вучобы час, арганізуе студэнцкія будатрады, а таксама выступае ў якасці пасрэдніка ў пошуках працы за мяжой. З дапамогай "Лігі" маладыя людзі, што добра валодаюць замежнымі мовамі, могуць стаць гувернёрамі ў сем'ях у еўрапейскіх краінах.

Асацыяцыя "Моладзь супраць злачыннасці" адраджае былыя оператрады, але ўжо на платнай аснове. Яна ж рыхтуе прафесійных ахоўнікаў для працы ў дзяржаўных і камерцыйных фірмах.

Пад эгідай асацыяцыі ў Гродна дзейнічае некалькі спартыўных клубаў ушу, ствараецца клуб славянскіх адзінаборстваў.

Лілія АСТРАВЕЦКАЯ.

Патрабуюцца ўласнікі

Паводле апошніх даных упраўлення "Брэстаблмаёмасць", на пачатак гэтага месяца з заявамі аб налічэнні прыватызацыйных чэкаў у вобласці звярнуўся толькі кожны чацвёрты жыхар.

Менш за ўсё жадаючых набыць прыватную ўласнасць у Пінскім, Баранавіцкім і Столінскім раёнах.

Каханне на... тры дні

Сенсацыйнае вяселле 88–гадовага і 28–гадовай нявесты ў Віцебску, аб чым у свой час паведамілі многія перыядычныя выданні, аказалася толькі пралогам судовага працэсу.

Позні маладажон у самым пачатку "мядовага месяца" зразумеў, што адзінай яго вартасцю ў вачах жонкі з'яўляецца кватэра. Абражаны стары звярнуўся ў суд з заявай аб разводзе.

БЕЛІНФАРМ.

Курсы валют на 24 чэрвеня:

	Даляр ЗША		Ням. марка	
	Скупка	Продаж	Скупка	Продаж
"Комплекс"	24840	25550	15460	15900
"Прыор"	25000	25300	15450	15700
"Пошук"	25200	25700	15300	15700

Сімпатыі не супалі

У чацвер, 23 чэрвеня, не ведаю, як у цэлым па рэспубліцы, а ў Серабранцы — мікрараёне сталіцы — было ветрана. Здавалася, што нехта нябачны ў прыродным катле шамацеў бярозавым венікам, перамешваючы, абрываючы карані быцця. Уласна кажучы, тое ж самае тварылася ў дзень выбараў першага прэзідэнта Рэспублікі Беларусі ў душах выбаршчыкаў. Знешнія і ўнутраныя прычыны: эканамічны хаос, палітычныя ваганні, сацыяльная няроўнасць зрабілі сваю справу. Многія, перш чым апусціць у урну для галасавання лісток у падтрымку таго ці іншага прэтэндэнта на вышэйшую пасаду, яшчэ раз узважвалі, супастаўлялі ў думках — за што змагаліся бацькі і чаго дасягнулі дзеці.

Аляксандр Кашэўскі, слесар механазборачных работ і Анатоль Тароцька, брыгадзір ліцейнага цэха № 2 вытворчага аб'яднання "Мінскі трактарны завод", узважыўшы магчымасці кандыдатаў у прэзідэнты, прагаласавалі за Зянона Пазьняка. "Мне падабаецца яго праграма, — сказаў Аляксандр, — тыя радкі, дзе, у прыватнасці, ідзе гутарка аб нацыянальнай валюце, эканамічных рэформах. Надакучыла нам працаваць ва ўмовах нестабільнасці. Хочацца, каб быў поўны рабочы тыдзень, зарабляць грошы ў адпаведнасці з затратамі энергіі, розуму. Ды і за родных і блізкіх крыўдна. Мой бацька, Мечыслаў Апалінар'евіч, цяпер, як кажуць, ужо стаіць убаку, на пенсіі. Але ж, зрэшты, як удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, двойчы паранены на яе франтах, а пасля, працуючы ў жывёлагадоўлі калгаса "Гайна" Лагойскага раёна, мог бы жыць лепей. А хіба разгонішся на 120 тысяч "зайчыкаў"?! Вось і перабіваецца. Добра, што трымае тое-сёе на падворку, ды дапамога пад бокам, жыве там з сынам Міхаілам. А так..."

Будзем шчырыя: у апошні час, сапраўды, заслугі людзей перад Айчынай параслі травой забыцця. Крыўдна гэта чуць. І тое, што людзі галасавалі за таго ці іншага кандыдата ў прэзідэнты, прадыктавана перш за ўсё жыццёвымі меркаваннямі, не выклікае сумнення. Не варта тут шукаць высокіх грамадзянскіх матываў, імпульсаў дзяржаўнага размаху.

Праўда, былі і іншыя меркаванні. Напрыклад, Іван Ліхадзіеўскі, інжынер-канструктар трактарнага завода і яго жонка Іна, выкладчыца цэнтра пазашкольнай работы, як і рабочы цэха дакладнага ліцця МТЗ Дзмітрый Крывецкі, аддалі свае галасы за Станіслава Шушкевіча. Чаму? Іна Іванаўна на гэты конт сказала наступнае: "Вывад з крызіснага становішча краіны ва ўсіх праграмах кандыдатаў настолькі туманны, што цяжка нават аддаць каму-небудзь перавагу. А Шушкевіч выклікае сімпатыю добрасумленнасцю, інтэлігентнасцю. За яго і прагаласавалі".

Так, розныя людзі і розныя прычыны пабуджалі падтрымку таго ці іншага кандыдата. Для Івана Ліхадзіеўскага і Іны Іванаўны мерай адліку ў дзень выбараў былі сумленне кандыдата, добрапрыстойнасць, чалавечнасць, бескарыслівасць. Мне ў той момант прыгадаліся чыесьці словы: "Чалавек стварыў спакусу. Устаць — крок да чалавека". Бескарыслівасць не ведае спакусы. Таму яна заўсёды — крок да чалавека. Пажадана, канешне, каб прэзідэнтам нашай шматпакутнай краіны стаў чалавек менавіта добрапрыстойны, бескарыслівы. Толькі ў гэтым выпадку можна было б разлічваць на нейкі пробліск святла ў будучыні народа. А пакуль...

Пакуль ішлі выбары. Тут, у Серабранцы, да выбарчых участкаў, што размясціліся ў будынках гімназіі № 1 імя Францыска Скарыны і СШ № 15, сцякаліся рабочыя сталічных прадпрыемстваў, служачыя, камерсанты, інтэлігенцыя. Задаволены былі іх ходам старшыні выбарчых камісій Зінаіда Вавілава, Эдуард Вансяцкі... У прыватнасці, паведаміў Эдуард Вансяцкі, да дзевяці гадзін прагаласавалі пятнаццаць працэнтаў выбаршчыкаў...

А, мабыць, у гэты ж час, там, за рачулкай Гайнай Лагойскага раёна, крочыў вясковай вуліцай да выбарчага ўчастка ветэран вайны Мечыслаў Кашэўскі. Аляксандр не ведае, за каго ён прагаласаваў. Але, на маю думку, за прыстойнага кандыдата.

Валянцін БАРЫСЕВІЧ.

Рэйтынг па-гомельску

У Гомельскай вобласці галасаванне пачалося яшчэ за дзесяць дзён да афіцыйнага дня выбараў. За першы тыдзень дзесяцідзёнкі ў вобласці прагаласавала 3955 чалавек, а ў апошнія дні — 31943, усяго 3,2 працэнта выбаршчыкаў.

Найбольшая актыўнасць насельніцтва прыпала на 22 чэрвеня: у гэты дзень прагаласавала 26530 чалавек.

23 чэрвеня на 1120 выбарчых участках вобласці на адзінаццаць гадзін раніцы прыйшло 38 працэнтаў выбаршчыкаў, на 15 гадзін — 65,4 працэнта, а да 19 гадзін — 71,4 працэнта.

Пасля закрыцця выбарчых участкаў аказалася, што з агульнай колькасці 1 млн. 136111 выбаршчыкаў прынялі ўдзел у галасаванні 890136 чалавек, або 78,35 працэнта. Гэтыя вынікі сведчаць аб высокай палітычнай актыўнасці, што, прынамсі, і прагназіравалася. Найбольшая ўдзельная вага прагаласаваўшых прыпадае на сельскую мясцовасць, а найменшая — на індустрыяльныя цэнтры. Так, у Гомелі прыйшло на ўчасткі 67 працэнтаў выбаршчыкаў, у гарадах абласнога падпарадкавання — 74,73 працэнта, а раёнах — 88,62 працэнта. Паводле аператыўных звестак, са значным адрывам лідзіруе кандыдат А.Лукашэнка. На другім месцы В.Кебіч. Найбольшая верагоднасць, што менавіта гэтыя дэпутаты выйдуць у другі тур галасавання.

Анатоль ЗЛОТНІКАЎ.

ДЗЕВЯТАЕ НЕБА



Дзяжурныя па выпуску перакладчыкі Віктар КАПАЧЭЛЬ, Андрэй СІДАРАЎ, рэдактар Якаў ЯСЭПКІН.

"Еўраньюс"

Выбары ў Беларусі

Вялікую ўвагу да выбараў у Беларусі праявілі замежныя сродкі масавай інфармацыі. Ужо зранку ў пятніцу "Еўраньюс" перадавала папярэднія вынікі.

У Беларусі 23 чэрвеня адбыліся выбары прэзідэнта. Першы тур, згодна з законам, не выявіў пераможцу, але вызначыў лідэра і... прынёс нямала нечаканасцей. Насуперак прагнозам, першы тур выйграў былы старшыня антыкарупцыйнай камісіі Вярхоўнага Савета Беларусі А.Лукашэнка.

Аператыўная рэакцыя Галівуда

Галівуд хутка адрэагаваў на арышт акцёра Сімпсана па абвінавачванні ў забойстве двух чалавек.

Розныя студыі намагаюцца атрымаць правы на экранізацыю гісторыі жыцця кіназоркі. Акцёры Дэнзел Вашынгтон і Веслі Снайпс прэтэндуюць на ролю "падшага анёла". Сам Сімпсан цяпер знаходзіцца ў турме пад пастаянным назіраннем, бо ёсць небяспека, што ён можа зрабіць спробу самагубства.

"Greenpeace" пратэстуе

У Любушы, непадалёк ад Парыжа, адкрыўся міжнародны салон захоўвання зброі.

Зброя з 11 еўрапейскіх краін знаходзіцца ў экспазіцыі. Міністр абароны Францыі Леатар заявіў, што неабходна ўзмацняць сумесную работу па вытворчасці зброі ў Еўропе, каб яна магла скласці канкурэнцыю амерыканскім аналагам.

У сваю чаргу прадстаўнікі арганізацыі "Greenpeace" выказалі пратэст супраць гэтай акцыі. На іх думку, у салоне сабраны зусім не тыя "сродкі", пры дапамозе якіх можна ўсталяваць стабільнасць у Еўропе і свеце.

"Суперчэннэл"

Трагедыя ля Белфаста

Экстрэмісты–пратэстанты забілі ў Паўночнай Ірландыі 6 католікаў, якія глядзелі ў вясковай піўной матч чэмпіянату свету па футболу.

Забароненая Ірландская рэспубліканская армія, якая, паводле яе заяў, змагаецца за тое, каб Паўночная Ірландыя ўваходзіла ў склад Вялікабрытаніі, узяла на сябе адказнасць за забойства. Трагедыя адбылася ў 30 кіламетрах на паўднёвы ўсход ад Белфаста.

Шлюбныя паслугі ад Дыснея

Знакамітая кінакампанія Уолта Дыснея прапанавала новую шлюбную цырымонію — спецыяльна для аматараў мультфільмаў.

Нявесты цяпер могуць пакрасавацца ў сукенцы Русалачкі ці пад'ехаць да царквы ў карэце Папялушкі. Такое вяселле звычайна абыходзіцца ў 20 тысяч даляраў, але часам кошт можа даходзіць да 100 тысяч даляраў.

"Уорлднэт"

Настальгія па Джэксану

Першая песня, якая стала пачаткам сольнай кар'еры Майкла Джэксана, паступіць у продаж на наступным тыдні — праз 25 гадоў пасля таго, як яна зрабілася гітом.

Бен Браўн, кіраўнік студыі "Сцілтаўн Рэкордз", дзе Джэксан запісваў свае першыя песні, расказаў, што нядаўна "знайшоў на сваёй кухні" арыгінальныя запісы Майкла. Браўн будзе гандляваць запісам гіта № 1 нават па пошце — за 30 даляраў. У пакет увойдуць касета, кампакт-дыск і гісторыя стварэння песні.

Страсці вакол магніткі

Германія жадае стварыць магнітную чыгунку. Згодна з гэтым праектам, да 2005 года на лініі Берлін—Гамбург будуць курсіраваць скорасныя цягнікі.

Хуткасць дасягне 400 кіламетраў у гадзіну. Праціўнікі праекта звяртаюць увагу ўрада на тое, што Германія будзе ізалявана ад еўрапейскага скораснага гнязда.

"TV-5"

Жаночы дзень у Шатландыі


У Шатландыі днямі адбылося свята, прысвечанае жаночаму дню.


На ім прысутнічалі ўсе члены старэйшых каралеўскіх сямей. Паказальныя шоу, дэманстрацыя мод сталі ўпрыгожаннем свята, якое завяршылася, аднак, непрыемным інцыдэнтам: пад час скачак адзін вершнік упаў з каня і атрымаў пашкоджанні.

ПАВЕДАМЛЕННІ, АТРЫМАНЫЯ ПА КАНАЛАХ СПАДАРОЖНІКАВАЙ СУВЯЗІ "ЧЫРВОНАЙ ЗМЕНЫ"

Прэзідэнцкі марафон

(Заканчэнне. Пачатак на 1-ай стар.)





Гэтыя здымкі зроблены на выбарчым участку № 76 Маскоўскага раёна горада Мінска. Назіралася высокая палітычная актыўнасць выбаршчыкаў усіх слаёў насельніцтва.

Галасаванне праходзіла ў часткова прынятым будынку школы, што не садзейнічала святочнаму настрою людзей, многія з якіх прыходзілі на выбарчы ўчастак сем'ямі. Як адзначыў старшыня ўчастковай выбарчай камісіі Аляксандр Фёдаравіч Сташэўскі, сродкаў на правядзенне выбараў было выдзелена недастаткова.

Вось бы ўспомніць былыя часы, калі гучалі аркестры і песні!

Фота Сяргея БРУШКО.



Я — за адраджэнне Беларусі

Прызнаюся шчыра, я непакоілася, што людзі не будуць галасаваць. Пераконвала суседзяў, знаёмых, што трэба ісці, бо такія вялізныя грошы (120 мільярдаў) затрачаны на арганізацыю выбараў. Але народ наш аказаўся свядомым і мудрым — прагаласавалі амаль 80 працэнтаў ад унесеных у спісы. На выбарчым участку № 54 ва Уруччы, што знаходзіўся ў 188-й школе, панавала спакойная, дзелавая абстаноўка. У выбарчай камісіі былі прадстаўнікі розных партый. Я паназірала, як людзі паводзілі сябе пры галасаванні: адчувалася, што яны галасуюць асэнсавана, робяць свядомы выбар.

Дадзім слова аднаму з выбаршчыкаў, студэнту БПА Віктару Яцыновічу:

— На сённяшні дзень я не бачу іншай кандыдатуры на пасаду прэзідэнта Беларусі акрамя Зянона Пазьняка. Я свядома прагаласаваў за яго. Бо хачу, каб з нашай Бацькаўшчынай лічыліся ў свеце, каб развівалася нацыянальная культура. Яшчэ мне імпануюць у яго праграме дакладнасць эканамічных мэтаў, усведамленне што і як трэба рабіць. Я не ўпэўнены, што Пазьняк пераможа, вельмі шмат падводных рыфаў, але думаю многія аддадуць яму свой голас, бо людзі пачалі разумець, што трэба адраджаць Радзіму.

Вера ШЧЭЦІНА.

Хуткіх перамен не чакаецца

За час перадвыбарнай кампаніі гродзенцы мелі магчымасць пазнаёміцца не толькі з праграмамі ўсіх кандыдатаў у прэзідэнты, але і з кожным з іх асабіста. Усе прэтэндэнты правялі па некалькі сустрэч з выбаршчыкамі абласнога цэнтра. Асабліва шырокую агітацыйную кампанію разгарнула каманда мясцовага кандыдата — старшыні аграфірмы "Прагрэс" Гродзенскага раёна Аляксандра Дубко.

Зацікаўленасць выбарамі адчувалася ў горадзе, перавагі і недахопы прэтэндэнтаў актыўна абмяркоўваліся і ў мясцовых сродках масавай інфармацыі, і ў працоўных калектывах, і проста на вуліцах. Аб неабыякавасці гродзенцаў сведчыла іх актыўнасць у дзень выбараў, ужо, паводле папярэдніх даных, на 11 гадзін раніцы прагаласавала больш за 30 працэнтаў выбаршчыкаў.

— Першым прэзідэнтам самастойнай Беларусі хацелася б бачыць чалавека сумленнага, здольнага вывесці краіну з крызісу. Кожны выбера таго, каго лічыць вартым, — гэта думка аднаго з выбаршчыкаў, урача А.Г.Хорава, і яе падзяляюць многія.

На жаль, прэтэндэнты, на мой погляд, не выкарысталі цалкам магчымасцей перадвыбарнай кампаніі. Адсутнасць вопыту яе правядзення прывяла да таго, што выступленні большасці кандыдатаў звяліся да неканструктыўнай крытыкі апанентаў.

Прэтэндэнты не распрацавалі добра свой імідж, недаацанілі таго, што людзі будуць аддаваць свае сімпатыі і антыпатыі не толькі іх праграмам, але і ім самім як асобам. Напрыклад, адна мая знаёмая не прагаласавала за Пазьняка толькі таму, што ён падаўся ёй вельмі суровым, пахмурным чалавекам, які "нават не ўсміхнецца ніколі".

А вось на пытанне, што зменяць выбары ў нашым жыцці, адказы былі розныя. Большасць усё ж вельмі мала спадзяецца на хуткія добрыя перамены, разумеючы, што эканамічнае адраджэнне — справа не аднаго месяца і залежыць яна не ад аднаго толькі прэзідэнта.

Лілія АСТРАВЕЦКАЯ.

Выбар зроблены?

Кожны на свае вочы бачыў, як праходзіла перадвыбарчая кампанія. Наўрад ці адносіны да сапернікаў з боку кандыдатаў можна было назваць джэнтльменскімі. Брудныя публікацыі ў газетах, якія абражаюць чалавечы гонар палітыкаў, нявытлумачаная гісторыя з замахам на кандыдата, узаемныя абвінавачванні, якія рабіліся галоўным козырам. І ўсё ж каля 65 працэнтаў выбаршчыкаў прыйшлі на выбарчыя ўчасткі, каб сказаць "не" — пяці і "так" — аднаму (за выключэннем тых, хто ў сэрцах выкрэсліў усіх шэсць). Значыць, нягледзячы на ўсё, вера на нейкія перамены ў людзей яшчэ засталася. І вера гэта звязана непасрэдна з выбарамі першага прэзідэнта Беларусі.

Участак, на якім давялося галасаваць аўтару гэтых радкоў, змешчаны ў школе № 172, што ў Заводскім раёне. За тры дні да выбараў паднавілі фарбаю сёе-тое на фасадзе, вывесілі бела-чырвона-белы сцяг. У дзень выбараў сцяг нечакана знік, як высветлілася, апынуўся на адным з двух, размешчаных у школе, участкаў ("разумееце, беднасць, — тлумачылі мне, — у школе толькі адзін дзяржаўны флаг"). Паводле маіх назіранняў, з самай раніцы галасавалі адзінкі, асноўная маса выбаршчыкаў аддала перавагу поўдню, а, па звестках, атрыманых мною ва ўчастковых камісіях, да гадзіны дня прагаласавалі 45 працэнтаў спісачнага складу выбаршчыкаў.

Людзі старэйшага ўзросту прызвычаіліся, што за даўнімі часамі гандлёвыя кропкі на выбарах — гэта таксама магчымасць выбару і неблагая, дарэчы. Здаецца, рынак не дапускае танных трукаў з выбаршчыкамі ў дзень выбараў (прынамсі, на выбарчым участку, у суседняй са школай краме, напрыклад, у дзень выбараў нечакана з'явілася ў продажы выдатная свініна па пятнаццаць тысяч за кілаграм, што не магло быць не заўважана большасцю выбаршчыкаў, асабліва жаночага полу).

На школьным стэндзе побач са спісам пакінутых на другі год вучняў — партрэцікі і кароткія біяграфіі ўсіх кандыдатаў на прэзідэнцкую пасаду. Сюды людзі падыходзяць нячаста — пераважная большасць зрабіла свой выбар ужо даўно. На 34-м участку па традыцыі ўсё было зацягнута кумачом і, акрамя маленькай "пагонькі" на урне для бюлетэняў, ніякай дзяржаўнай сімволікі (нават той жа адзіны флаг трапіў на суседні ўчастак).

Дарэмна, дарэчы, не тлумачылі загадзя, як выкрэсліваць. Хоць і зрэдку, але ўзнікалі пытанні: выкрэсліваць, напрыклад, адну левую частку (прозвішча) ці абедзве. Пытанне, здаецца, простае, але таксама не выключае магчымасць кансультацый у момант выбару.

На выбарчых участках № 34 і 35 было па назіральніку. Абодва — з Беларускага народнага фронта. Як вядома, толькі сто замежных назіральнікаў сачылі за выбарамі першага беларускага прэзідэнта ў той час, як выбарчых участкаў значна болей.

Мяркуючы па ўсяму, праз два тыдні нас чакае другі тур. Наколькі зладжана ён пройдзе з улікам усіх недахопаў першага — пакажа час. Застаецца спадзявацца, што на працягу гэтых двух тыдняў палітыка кандыдатаў будзе больш карэктнай, чым раней. Інакш можна і не дачакацца выбаршчыкаў на ўчастку.

Лілія ГРЫНЯВЕЦКАЯ.

Лепш Пазьняк, чым ніколі

Дзе даведваешся пра ўсе навіны ў новым мікрараёне? Так, у чаканні ля тэлефона-аўтамата. Вось і ў дзень выбараў мне давялося пачуць такі маналог:

— Ну што, мама, прагаласавала? За каго? Новікаў? Лукашэнка? Як буфет? А мы, уяўляеш, першыя прыйшлі, дык хаця б кветачку падарылі...

Цэлы дзень у горадзе віравалі слоўныя баталіі. Спрачаліся сваякі, знаёмыя і нават проста людзі ў чэргах. Як ні "радаваў" урад выбаршчыкаў: і танным мясам, і цёплай вадой (нават з халоднага крана), і багатым асартыментам агародніны ля выбарчага ўчастка, але "даставалася" яму "на арэхі" моцна.

Напярэдадні выбараў тэлебачанне ва Уруччы добра паказвала толькі беларускую праграму, дзе ўсе агітавалі толькі за Кебіча.

Мой асабісты выбар, магчыма, быў бы больш узважаны, каб не было гэтых перадач. Галасуючы за Пазьняка, я галасавала супраць Кебіча.

Пакуль яшчэ невядома канчаткова, якія вынікі будуць у маштабе рэспублікі, але на выбарчым участку № 63 Першамайскага раёна яны былі наступныя: за Шушкевіча выказалася 629 чалавек, за Лукашэнку — 568, за Кебіча — 460, за Пазьняка — 430, Новікаў набраў 117 галасоў, Дубко — 99. Супраць усіх прагаласавала 82 чалавекі. Несапраўднымі былі 32 бюлетэні.

Наталля ПЛЫТКЕВІЧ.

Ці заззяе сонца?

То дождж, то сонца... Для надвор'я, як і для настрою, таксама характэрныя крайнасці. "За каго галасуеце?" "За Новікава". "Трэба ж! А мы — за Пазьняка..." На подступах да выбарчага ўчастка № 4 — традыцыйная чарга па "дэфіцыты". Нічога асаблівага ў продажы няма, і народ марнуе тут час, хутчэй за ўсё, па добрай старой звычцы. Што заўважаецца адразу і, на маю думку, увогуле з'яўляецца прыкметай першых прэзідэнцкіх выбараў — людзі спачатку імкнуцца аддаць голас за таго ці іншага кандыдата, а ўжо потым накіроўваюцца ў буфет.

У бойкай ружавашчокай прадаўшчыцы — прыўзняты настрой. Папрасіўшы прабачэння ў чаргі, яна налівае ў шклянку кока-колы і, узняўшы руку ўгару, прапануе "тост": "За вашага будучага прэзідэнта!"

Пакуль што мы жывём палітычнымі прагнозамі, кожны з якіх можа аказацца настолькі ж далёкім ад ісціны, як і "бязвоблачнае надвор'е", прадказанае сіноптыкамі напярэдадні выбараў.

— Магчыма, мой "голас" нічога не вырашыць, але сёння я сапраўды адчуваю адказнасць за лёс сваёй краіны, — падзялілася сваімі думкамі Алена Лышчыцкая. Яна — малады спецыяліст, працуе таваразнаўцам у ГУМе, разам з мужам выхоўвае пяцігадовую дачку. — Амаль да апошняй мінуты не ведала, каго з кандыдатаў пакінуць у бюлетэні. Дзейнічала метадам "ад супрацьлеглага". Адразу выкрэсліла Пазьняка — не магу даверыць лёс і будучыню свайго дзіцяці нежанатаму чалавеку. Ну, а пра канчатковы выбар гаварыць не хачу — якая розніца? Усё роўна заўтра ад гэтага не стане больш прадуктаў на прылаўках.

Алена Салавей, выхавальніца дзіцячага сада, таксама маладая мама, аддала перавагу В.Кебічу, які імпануе ёй не толькі як палітык, але і як чалавек.

— Не ўпэўнена, што калі сённяшні прэм'ер стане прэзідэнтам, на нас зваляцца матэрыяльны дабрабыт і сацыяльныя гарантыі. І ўсё ж, выбіраючы Кебіча, я такім чынам галасую за стабільнасць, ураўнаважанасць і перавагу разумнага сэнсу.

У старшыні ўчастковай камісіі выбарчага ўчастка № 4 Анатоля Уладзіміравіча Галяткіна свае меркаванні адносна вынікаў галасавання, але імі ён дзеліцца "не для прэсы". Толькі праз дзесяць дзён стане дакладна вядома, хто з кандыдатаў атрымае права на далейшую перадвыбарную барацьбу. А пакуль што... У Анатоля Уладзіміравіча быў напружаны дзень, хоць, на першы погляд, здаецца, што прайшоў ён даволі спакойна. Дарэчы, на гэтым самым участку галасаваў за кандыдата на пасаду будучага прэзідэнта сённяшні Старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі Мечаслаў Грыб (падзея, якую з поспехам трансліравала Беларускае тэлебачанне). Безумоўна, святло тэлевізійных юпітэраў унесла некаторую разнастайнасць у агульную размеранасць дня. Анатолю Уладзіміравічу далі зразумець, што нядрэнна было б "прадумаць", як сустрэць высокага госця... Ён настаяў на сваім: усе выбаршчыкі роўныя перад законам і дадзеным гістарычным момантам.

І з гэтым нельга не пагадзіцца.

Наталля КАРПЕНКА.

Час аб'яднацца

Як і мільёнам маіх землякоў мне, вядома, неабыякава будучае зямлі нашай і яе народа, пра вартае існаванне якога марыла не адно пакаленне людзей. Рэальнае жыццё, на жаль, адносілася і адносіцца да гэтых людзей з непавагай, і нам даводзілася выжываць у любых умовах і пры любых правіцелях.

Усім нам можа дапамагчы толькі надзея аб'яднання ўсіх нармальных людзей — разумных, добрасумленных, сціплых, тых, хто жадае дабра не толькі сабе, але і іншым, нашаму грамадству і народу. Хто ж можа стаць такім аб'ядноўваючым пачаткам? Менавіта над гэтым я думаў калі вырашаў, якому з кандыдатаў у прэзідэнты аддаць свой голас. Я зрабіў свой выбар і прагаласаваў за Аляксандра Лукашэнку. Пры ўсіх спрэчках наконт гэтай асобы нельга не прызнаць, што А.Лукашэнка бліжэй за іншых стаіць да магчымасці пачаць станоўчыя змены ў нашым грамадстве, неабходнасць якіх ужо наспела. І калі ён зможа аб'яднаць нашых грамадзян для арганізацыі нармальнага грамадства, не наламаўшы пры гэтым дроў, то паўнамоцтвы прэзідэнта будуць даверaны яму недарэмна.

Уладзімір ЛЯЎДАНСКІ.

Прыярытэты завадчан

Заводскі раён беларускай сталіцы ў дзень выбараў, прама скажам, не вызначаўся залішняй пасіўнасцю: з ранку да вечара на выбарчыя ўчасткі цягнуліся ручаінкі людской плыні.

За каго ж галасуюць завадчане? Бадай, іхнія прыярытэты вызначыла і тое, што тут, на Паўночным пасёлку, жыве адзін з кандыдатаў у прэзідэнты, лідэр парламенцкай апазіцыі БНФ Зянон Пазьняк. Прынамсі ён аказаўся аб'ектам увагі большасці гаворак, што адбыліся ў мяне ля ўчасткаў № 32 і № 33, якія размясціліся ў памяшканні СШ № 68.

Уладзімір Сівакоў, шафёр-выпрабавальнік Мінскага аўтазавода:

— Па шчырасці, выбары спярша мяне не цікавілі. Народ у нас звычайна не пытаюць. Але бачу, што будзе сапраўдная барацьба — ад кожнага залежыць заўтрашні дзень. Мой выбар — Зянон Пазьняк. Я, праўду кажучы, не ведаю, што ўяўляе сабой БНФ, але хоць яўна відаць тут, што гэта не хапун. Дый ці з кожным народным дэпутатам вам даводзілася ездзіць у адным аўтобусе? А Пазьняка я часта бачу на прыпынку "дваццаткі".

Калега гэтага суразмоўцы, шафёр аўтакамбіната Іван Зайкоўскі, пры той жа пазіцыі мае іншыя аргументы:

— Я аддаў голас за Пазьняка, бо быў на ягоных сустрэчах, знаёмы з ягонымі мэтамі. Беларусі абавязкова патрэбны змены, а адзіны сімвал змен у гэтай камандзе — Пазьняк.

Няцяжка было зразумець і тых, хто не выяўляў адкрыта сваіх прыхільнасцяў. Мы ж усе памятаем часы, калі думка, выказаная не ў пераможным хоры, вызначала далейшы лёс чалавека. Дый тайнасць працэдуры — неад'емнае права выбаршчыка.

...Вось ідзе з участка маладая сям'я — бацька, маці і дачка:

— Мы галасавалі не за ўчарашні дзень, а заўтрашні. Падобную думку выказала і жанчына яўна пенсіённага ўзросту:

— Адны ўжо дастаткова накіраваліся на нашых плячах. Трэба даць шанц новым.

Многія абураліся падзеямі вакол выбараў:

— Што ж гэта такое: у дзень выбараў забаронена агітацыя, а тэлебачанне зранку працягвае нахвальваць прэм'ер-міністра? А я вось спецыяльна прагаласую за таго, хто менш за ўсіх быў на экране.

Зразумела, гэтымі гутаркамі я не прэтэндую на вычарпальную аб'ектыўнасць. Мо проста ў іх адбіліся мае асабістыя палітычныя прыхільнасці, а ў размовах, натуральна, цягне да аднадумцаў. Але факт: яны выяўляюць і рэальны рост рэйтынгу Пазьняка. Як улічыць такую рэальнасць той, хто пераможа канчаткова ў выбарах, — пакажа час.

Вітаўт МАРТЫНЕНКА.

Хмарна. Месцамі — ураган

Чэрскі сельскі выбарчы ўчастак нумар дзесяць Лепельскага раёна. Прыходжу а сёмай гадзіне, акурат да адкрыцця, чакаю ўбачыць чаргу па бюлетэні, але бачу пустую залу, дзіўлюся. Зрэшты, чаго дзівіцца: людзі пагналі кароў у поле і заняліся гаспадаркаю, а выбары пачакаюць. Не раней — цяпер нікога не падгоніш, нікому не навяжаш "патрэбнага" кандыдата, як бы соладка за яго ні агітаваў, цяпер у кожнага свая галава на плячах.

Участак не самы вялікі на Лепельшчыне, усяго 370 выбаршчыкаў, затое ўсе адзін аднаго ведаюць. Толькі а дзявятай гадзіне народ паваліў валам. Хто на выбарчы ўчастак, а хто і ў краму, дзе, дзякаваць прэзідэнцкім выбарам, сёння царскі прывоз: гарэлка па дзяржцане і ўволю, розныя прысмакі на закусь, пачынаючы ад свежых памідораў і гуркоў, хаця і дарагіх, але ж такога, як кажуць, людзі не бачылі, мабыць, сто гадоў. Затое галасаваць за прэзідэнта ідуць дружна і нават весела, удзячныя родным уладам за раптоўную да іх увагу.

— Я за іх за ўсіх прагаласавала б, — скардзіцца бабулька на прэтэндэнтаў, — каб хоць каторы паабяцаў дажджы спыніць. Бульбачка вунь уся як ёсць вымакла.

Тым часам Лепельшчына актыўна галасуе. Паводле звестак старшыні раённай выбарчай камісіі Надзеі Іванаўны Куц, ужо да адзінаццаці гадзін раніцы тут аддалі свае галасы 46,6 працэнта выбаршчыкаў, да пятнаццаці гадзін іх колькасць перасягнула дзве трэці. Такім чынам, выбары ў раёне адбыліся. Адбыліся яны і ў Чэрцах, хаця і не без сюрпрызаў. Літаральна "пад заслону", калі камісія падлічвала ўжо галасы, раптам адключылася тэлефонная сувязь. Ці то ўраган таму віною, ці яшчэ што, толькі вашаму карэспандэнту з цяжкасцю ўдалося перадаць гэты рэпартаж у рэдакцыю. Стыхія, аднак, не перашкодзіла Аляксандру Лукашэнку, набраўшы 252 галасы выбаршчыкаў, з вялікім адрывам ад астатніх выйсці пераможцам. І гэта, на мой погляд, быў другі сюрпрыз. Можа, ён некаму будзе і не падабацца, толькі ж, пагодзімся, селянін ведае, што і як яму рабіць.

Уладзімір МІХНО, уласны карэспандэнт па Віцебскай вобласці.

P.S. Калі вярстаўся нумар, сталі вядомы вынікі галасавання на Лепельшчыне. За А. Лукашэнку прагаласавала 14 тысяч 620 выбаршчыкаў, што складае 48 працэнтаў. Каля 25 працэнтаў аддалі свае галасы за Кебіча, астатнія галасы размеркаваліся наступным чынам: Дубко — 2378, Пазьняк — 1376, Шушкевіч — 1259, Новікаў — 950.

Бізнес-клас

Вядучая рубрыкі Вера ПАЛЯКОВА

Тэл. 68-28-52

Ведаеш сам – падзяліся з іншым

Маючы на ўвазе востры дэфіцыт спецыялістаў рыначных прафесій цэнтр падтрымкі прадпрымальніцтва "Цэнтр—XXI стагоддзе" паставіў перад сабой задачу дапамагчы дзяржаве вырашыць гэтую праблему. У цэнтры можна перакваліфікавацца і атрымаць такія спецыяльнасці як сакратар-рэферэнт, кіраўнік МП, бухгалтар вышэйшай кваліфікацыі і г.д.

Не так даўно ў "Цэнтры—XXI стагоддзе" адкрылася сапраўдная школа камерцыі і прадпрымальніцтва для гандлёвых працаўнікоў буйных прадпрыемстваў, якая працуе сумесна з нямецкімі фірмамі "IFBB" (г.Бон) і "Эдуплан" з Дрэздэна. Апошняя інтэнсіўна супрацоўнічае ў Расіі, Украіне, Польшчы, Чэхіі і дапамагае паспяхова пераадолець краінам былога сацлагера пераходны перыяд да стабільнай эканомікі. Ва ўсякім разе, абедзве фірмы вельмі ўдала прымянілі свой вопыт пры аб'яднанні Германіі.

Зараз дырэктары гандлёвых прадпрыемстваў, сярод якіх прадстаўнікі 6 буйнейшых крамаў Мінска, навучаюцца па спецыяльнасці "камерцыйны дырэктар", каб спасцігнуць усе хітрыкі гандлёвага бізнесу. Фінансуе гэты курс Міністэрства замежных спраў Германіі. Дарэчы, усе семінарскія і практычныя заняткі група беларускіх бізнесменаў будзе праходзіць у ФРГ, дзе адразу зможа наладзіць сувязі з нямецкімі прадпрымальнікамі напрамую, без усякіх пасрэднікаў.

Энергетыка "Ад Буша"

Сусветна вядомыя кампаніі паступова ўкараняюцца ў эканоміку ўсходніх суседзяў. Аналагічным чынам зрабілі і прадстаўнікі альянсу з двух энергетычных гігантаў Швецыі і Швейцарыі — канцэрна "АББ". У Мінску адбылася прэзентацыя адной з кампаній гэтага канцэрна — нямецкай фірмы "Буш Егер Электра", якая з'яўляецца на сённяшні дзень лідэрам еўрапейскага рынку ў галіне электраўстановачнага абсталявання.

Гаспадарка канцэрна "АББ", які мае свае прадстаўніцтвы ў Расіі, Казахстане, на Украіне складаецца з электрастанцый, прамысловых аб'яднанняў, прадпрыемстваў сувязі і распаўсюджання энергіі. Прадукцыя фірмы прыжылася ў 140 краінах свету, а абарот "АББ" за 1993 год склаў 30 мільярдаў даляраў ЗША.

Фірма "Буш Егер Электра" прадстаўлена канцэрнам "АББ" у 44-х краінах свету. Доля яе прадукцыі на рынку Германіі складае 33 працэнты і займае першае месца, а на рынку Еўропы — 15 працэнтаў і трымае другое месца. З гэтага часу ў мінскіх магазінах, якія гандлююць нямецкай тэхнікай, можна будзе набыць электратэхнічнае абсталяванне "Ад Буша". Кіраўнікі гандлёвых дамоў, архітэктары, прадстаўнікі Дзяржбуда і альтэрнатыўных будаўнічых кампаній, маюць намер уключыць прадукцыю "Буш Егер Электра" ў працэс планавання і ўзвядзення новых збудаванняў і дамоў у рэспубліцы. Акрамя традыцыйных выключальнікаў і разетак, выпуск якіх у год складае 18 і 22 мільёны штук адпаведна, асабліва зацікавілі беларускі бок сістэмы кантролю за светлавым фонам, дэтэктары інфрачырвоных выпраменьванняў, рэгулятары сілы святла.

БЕЛІНФАРМ.

Бясплатная газета

Прыемна здзіўлены былі жыхары Гродна, калі знайшлі ў сваіх паштовых скрынках першы нумар новай рэкламнай газеты "Гродненская ярмарка". Без афармлення падпіскі абсалютна бясплатна яна будзе штотыдзень прыходзіць у кожны гродзенскі дом.

Такім арыгінальным спосабам ейны выдавец МП "Ярмарка" вырашыў скласці канкурэнцыю стабільнаму і папулярнаму "Рекламному приложению" да "Гродзенскай праўды". За рэкламу ў "Ярмарцы" плацяць толькі ейныя падаўцы, а патэнцыяльныя спажыўцы атрымліваюць задарма.

Дарэчы, некамерцыйная інфармацыя ў "Гродненской ярмарке" друкуецца бясплатна.

Лілія АСТРАВЕЦКАЯ.

ЭКАНОМІКА

Як жывяце-можаце, наватары вытворчасці?

□ **Леанід ПАТАПОВІЧ**

Сёння ў Рэспубліцы Беларусь праблема тэхнічнай творчасці знаходзіцца на самым нізкім узроўні. Скарачаецца колькасць рацыяналізатараў на вытворчасці. Усё менш і менш падаецца рацпрапаноў, шмат якіх гадамі не ўкараняецца.

Наогул, ці неабходна рацыяналізацыя? Мы ведаем, што страта выкарыстання энергетычных рэсурсаў у прамысловасці Рэспублікі Беларусь складае ад 10 да 60, у камунальным сектары — ад 40 да 80 працэнтаў. Вось на гэта і накіроўваюць сваю дзейнасць рацыяналізатары нашай рэспублікі. Прывяду прыклад. Шмат дзесяткаў гадоў працаваў на МАЗе слесарам І.Д.Забаўчык, на яго ліку больш за 520 укаранёных рацпрапаноў. Ужо будучы на пенсіі, у сакавіку 1993 года ён самастойна ўкараніў рацпрапанову, якую падаў яшчэ ў 1985 годзе. Яна дала эканомію ў суме 1 мільён 660 тысяч рублёў. Узнагарода склала каля 10 тысяч рублёў. "Справа не ў грашах, — гаворыць Забаўчык, — шкада, што за гэтыя гады столькі металу пайшло без толку".

Яшчэ прыклад. Шмат гадоў на МАЗе для вырабу плунжэра прычэпа прымянялі прэс у 600 тон. Ілля Дзмітрыевіч разам з іншымі работнікамі завода зрабіў 36-тонны прэс. Эканамічны эфект склаў паўтара мільёна рублёў. Гэта толькі ў 1993 годзе!

Дык як жывуць наватары вытворчасці нашай рэспублікі?! Можна адказаць адным словам — дрэнна! Іх дзейнасць трымаецца толькі на асабістым энтузіязме.

Няўжо мы такія багатыя на рэсурсы, што не ўдзяляем увагі наватарству, рацпрапановам? Вядома ж, не. Варта памятаць і аб тым, што наватарамі не нараджаюцца, імі становяцца, і іх творчае развіццё залежыць ад спосабу жыцця.

Больш за 35 гадоў я прапрацаваў у станкабудаванні. За гэты час укараніў каля 300 рацпрапаноў. Пабываў больш чым на 500 прадпрыемствах у 55 гарадах краін СНД, дзе непасрэдна на працоўных месцах дэманстраваў свае распрацоўкі. Усё гэта дае мне права сказаць, што тэхнічная творчасць зараз упала ў нас да неверагодна нізкага ўзроўню. Неабходны новыя метады працы. Цяпер некаторыя кіраўнікі прадпрыемстваў, цэхаў глядзяць на наватара як на дзівака.

Хачу нагадаць адзін эпізод. Паслала адміністрацыя аднаго прадпрыемства рабочага-наватара і інжынера-канструктара ў Маскву на ВДНГ паглядзець, што ёсць новага ў галіне металаапрацоўкі. Тыя прывезлі апісанне, чарцяжы, эскізы, праспекты: толькі ўкараняй! Прыходзяць да галоўнага інжынера. Той падпісвае камандзіровачныя, а пакет дакументаў выкідвае ў карзіну для смецця. Маўляў, Маскву паглядзелі ды й годзе. Вядома адміністрацыі лягчэй на сваю прадукцыю падняць цану, чым валтузіцца з новаўвядзеннямі.

Цяпер заслужаныя рацыяналізатары Рэспублікі Беларусь ідуць на пенсію і чакаюць ад дзяржавы дапамогі. Яны маюць ганаровыя званні, але не змаглі за мізэрныя ўзнагароджанні забяспечыць сваю старасць.

Вось і я ўжо некалькі гадоў на пенсіі, а з заводам сувязі не спыняю. Падаю рацпрапановы, дапамагаю ўкараняць іх. Бо рацпрапановы, як людзі, нараджаюцца, жывуць, паміраюць, каб зноў нарадзіцца ў новай якасці.

Вядома, што ў Беларусі зарэгістравана 29 арганізацый, якія павінны працаваць з моладдзю, на жаль усё не так! Не відаць і не чуваць іх работы.

Міністэрства культуры чамусьці не лічыць тэхнічную творчасць культурай. Вынаходніцтва і рацыяналізацыя — гэта рашэнне сацыяльных і тэхнічных праблем. Вынаходлівы інжынер, рабочы-наватар — такі ж рухавік культуры і прагрэсу, як пісьменнік, мастак, вучоны, артыст. Не займаецца гэтай праблемай і Камітэт па справах моладзі пры Савеце Міністраў рэспублікі.

У Мінску праходзіла выстава-кірмаш "Тэхнічная творчасць". Яна была арганізавана Дзяржкампрамам рэспублікі і Беларускім таварыствам вынаходнікаў і рацыяналізатараў і ставіла сваёй мэтай вызначыць найбольш эфектыўныя вынаходствы і рацпрапановы з наступным іх укараненнем на прадпрыемствах. Выстава паказала, што шмат ёсць новага на рабочых месцах, на прадпрыемствах, але, на жаль, пра гэта мала хто ведае.

Нам абавязкова неабходна стварыць Беларускі фонд садзеяння развіццю вынаходніцкай і рацыяналізатарскай дзейнасці пры Беларускім таварыстве вынаходнікаў і рацыяналізатараў (БТВР). Фонд зможа ажывіць наватарскую дзейнасць.

Цяпер жа беларускаму таварыству вынаходнікаў і рацыяналізатараў (БТВР) дзяржаўныя структуры амаль зусім не дапамагаюць. Вельмі шкада, што пра нас забылася Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі. Было б няблага, каб частку работы ў рэспубліцы па прапагандзе перадавога вопыту ўзяў на сябе Беларускі інстытут навукова-тэхнічнай інфармацыі і прагнозу Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

На жаль мы забылі слова перадавік. А перадавікі ёсць і будуць. За кошт сваёй творчасці яны робяць больш прадукцыі з выдатнай якасцю. Значыць, пра іх трэба гаварыць, прапагандаваць. Іх трэба заахвочваць, бо яны — патрыёты.

Талент ёсць у кожнага чалавека, толькі неабходны ўмовы, пры якіх ён мог бы стаць сталым і праявіцца. Значыць, трэба дапамагчы людзям развіць свае здольнасці цяпер, а не потым. Нам няма калі чакаць: час прыспешвае людзей на творчасць.

У старажытнасці гаварылі: "Свет таму вялікі, што не пагрэбаваў ніводнай сваёй пясчынкай". А наш залаты россып ідэй рацыяналізатараў часцей за ўсё залежваецца на паліцах. Хай некаторыя лічаць іх белымі варонамі, дзівакамі, галоўнае, што наватары сваёй справай замацоўваюць веру ў будучыню чалавека. І чым больш будзе рацыяналізатараў і вынаходнікаў ва ўсіх галінах прамысловасці або культуры — тым лепш мы будзем жыць.

■.





У рэспубліканскім дыспансеры НДІ радыяцыйнай медыцыны прайшоў конкурс медыцынскіх сясцёр.

Яго ўдзельніцы прадэманстравалі высокі прафесіяналізм, выдатную тэарэтычную падрыхтоўку і практычныя веды. Пераможцы атрымалі прызы і памятныя падарункі.

Фота Аркадзя НІКАЛАЕВА, БЕЛІНФАРМ.

■

ДЗЕЦІ І МЫ



Фота Сяргея БРУШКО.

Ёсць адказы на пытанні, ды не на ўсе...

□ **Мікола КАПЫЛОВІЧ**

Члены камісіі па справах непаўналетніх, якая дзейнічае пры Маладзечанскім райвыканкаме, выкарыстоўваюць самыя розныя формы і метады работы. Сярод іх — сустрэчы "за круглым сталом" з вучнямі вясковых школ, дзе вядуцца гутаркі аб жыцці і праблемах падлеткаў.

Не так даўно вучні старэйшых класаў Лебедзеўскай сярэдняй школы сустрэліся з дасведчанымі ў педагогіцы і веданні законаў суразмоўнікамі. І доўга задавалі ім пытанні.

Перш чым адказаць на некаторыя з іх начальнік інспекцыі па справах непаўналетніх Маладзечанскага ГРАУС У.А.Мароз, які прысутнічаў на гэтай сустрэчы, азнаёміў вучняў і настаўнікаў з крымінагенным становішчам у раёне. Ён адзначыў, што ў апошні час злачыннасць сярод падлеткаў расце. Так, у 1993 годзе 42 падлеткамі ажыццёўлена 46 злачынстваў. Сярод парушальнікаў закона ёсць шмат вучняў. Так, на працягу некалькіх месяцаў мінулага года на рахунку злачыннай групы, у якую ўваходзілі дваццаць восем 14—17-гадовых падлеткаў горада і раёна, 36 злачынстваў. Пачыналі, як заўсёды, з малога: лазілі ў падвалы, абкрадалі сваіх суседзяў, знаёмых. Потым рашыліся на больш буйныя крадзяжы. І, нарэшце, пачалі ўжо красці машыны і матацыклы, каб потым іх вывозіць за межы рэспублікі. Па гэтай справе вядзецца судовы працэс. Яшчэ адна злачынная кампанія рабавала навучэнцаў гарадскіх тэхнікумаў і вучылішчаў, адбіраючы пад пагрозай у іх грошы і каштоўнасці. Злачынцы затрыманы.

Сярод праваларушальнікаў, з горыччу паведаміў начальнік інспекцыі, ёсць і вучні Лебедзеўскай школы. Чацвёра з іх летась запрашала на свае пасяджэнні камісія па справах непаўналетніх. У цэлым па раёне, як паведаміла адказны сакратар вышэйназванай камісіі, летась разгледжана 99 спраў на 150 падлеткаў, сярод якіх 18 дзяўчынак і 80 хлапчукоў са школ раёна, астатнія — са школ-інтэрнатаў, прафесійна-тэхнічных вучылішчаў, тэхнікумаў, курсаў. Яны хуліганілі, кралі, пілі. Па кожнай справе былі прыняты адпаведныя меры ўздзеяння на падлеткаў і іх бацькоў. Проста знайсці прычыны, па якіх падлеткі адбіваюцца ад бацькоўскіх рук і пачынаюць красці і рабаваць людзей. Гэта, як адзначыў у сваім выступленні міжрайпракурор М.М.Каляда, цяжкае, а то і невыноснае матэрыяльнае становішча сям'і, у якой выхоўваецца падлетак, бяздумны спосаб жыцця. Ды і гультайства, п'янкі, парушэнні правілаў паводзін вядуць падлеткаў на шлях злачынстваў.

